пачатку XX ст. былі ў асноўным святары, выкладчыкі духоўных навучальных устаноў, настаўнікі закона Божага. Рэлігійныя выданні XIX – пачатку XX ст. у Мінску склалі 8% ад агульнай колькасці выдадзенай кніжнай прадукцыі ў гэты час у горадзе.

**Э.С.Дубянецкі,**
*кандыдат гістарычных навук*

## МЕНТАЛЬНАСЦЬ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА: СУТНАСЦЬ УЗАЕМАЎПЛЫВАЎ І ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ

У сферу ментальнасці арганічна ўваходзяць свядомыя і падсвядомыя ўстаноўкі, імпульсы, калектыўныя першавобразы (архетыпы, паводле тэрміналогіі К.Г.Юнга), рацыянальныя і эмацыянальныя імкненні, прыродныя і сацыяльна-культурныя, індывідуальныя і грамадскія ўяўленні, арыентацыі. Асноўнымі структурнымі адзінкамі (элементамі) менталітэту з'яўляюцца ўяўленні аб прасторы і часе, рэлігіі, чалавеку і грамадстве, а таксама аб Радзіме, жыцці, працы, сям'і, каханні, інтымных адносінах, праве і інш. Менталітэт вызначаецца дастаткова высокім узроўнем стабільнасці, унутранай маналітнасці і захоўваецца амаль нязменным на працягу многіх стагоддзяў.

Гістарычная эвалюцыя менталітэту звычайна адбываецца больш марудна ў параўнанні са зменамі ў эканамічнай і палітычнай сферах. Важнымі фактарамі ў станаўленні менталітэту выступаюць прыродна-біялагічны, звязаны з генафондам народа, прыродна-кліматычнымі і ландшафтнымі ўмовамі; сацыяльны, які выяўляецца ў спецыфічных рысах сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця, асаблівасцях сацыяльнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стратыфікацыі, працэсе сацыялізацыі і адаптацыі індывідаў ці груп насельніцтва да канкрэтных умоў жыцця [1].

У агульных рысах культуру можна вызначыць як працэс і вынік творча-стваральнай дзейнасці людзей. Замежныя даследчыкі ўключаюць у “сэнсавае поле” культуры інтэлектуальныя і эстэтычныя дасягненні, погляды індывідаў ці ўсяго соцыуму, а таксама стыль жыцця грамадства, які перадаецца з пакалення ў пакаленне. Культура патрабуе спецыфічных паводзін людзей, у выніку чаго ствараюцца розныя звычаі, рытуалы, мастацкія творы, цырымоніі, інстытуты, мовы, прадметы працы, ідэі, вераванні і інш. У сферу культуры ўключаюцца таксама тэхналогія, стылі адзення, асаблівасці вытворчасці і ўжывання ежы, а таксама палітыка-эканамічныя сістэмы. Доктар філасофскіх навук М.І.Крукоўскі сцвярджае, што культура ўяўляе “складаную і ў той жа час вельмі цэласную сістэму з выразнай іерархічнай будовай”, прычым сюды адносяцца найперш матэрыяльная, мастацкая і духоўная культуры [2].

Менталітэт выступае своеасаблівай крыніцай гісторыка-культурнага, духоўнага развіцця грамадства і асобнага чалавека. Менавіта розум, інтэлект з’яўляюцца той першаасновай, з якой пачынаецца творчая дзейнасць чалавека. На думку вялікага нямецкага паэта І.В.Гётэ, “мастацтва без розуму – мёртвае”, а найлепшымі мастацкія творы бываюць тады, калі ў іх гарманічна “сышліся і розум, і рука”. У розных феноменах мастацкай культуры заўсёды так ці інакш адлюстроўваюцца пэўныя асаблівасці ментальнасці прадстаўнікоў розных этнічных, рэлігійных, полаўзроставых супольнасцей людзей. Культурныя каштоўнасці, што ствараюцца людзьмі, спачатку быццам “нараджаюцца” ў іх свядомасці.

Ва ўмовах паглыблення агульнасусветнай глабалізацыі неабходна прыкладаць максімум намаганняў для таго, каб захоўваць сапраўднае аблічча роднай культуры, уласны унікальны менталітэт. Доктар культуралогіі, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.І.Смолік выказвае слушнае меркаванне аб тым, што асноўнай задачай прафесійнага мастацтва павінна быць "захаванне маральных каштоўнасцей, традыцыйных для беларускага народа, яго нацыянальнага менталітэту" [3]. Трэба пазбягаць штучнай акультурацыі, асіміляцыі, паколькі ў адваротным выпадку культура не здолее вытрымаць знешніх уплываў, асабліва так званай масавай культуры, якой нярэдка ўласцівыя безгустоўнасць, прымітывізм, пошасць і да т. п. Атрымліваецца так, што ва ўмовах засілля масавай культуры неабходна імкнуцца да развіцця індывідуальнай культуры, гэта значыць да створаных чалавекам-асобай, чалавекам-індывідам высокапрафесійных каштоўнасцей, якія, у сваю чаргу, з'яўляюцца вынікам яго інтэлектуальных высілкаў і працяглай падрыхтоўчай працы.

У сучасны перыяд на першы план выходзіць масавая культура, гэта вядзе да таго, што высокая, элітарная культура выціскаецца на перыферыю, у маргінальную культурную прастору. Масавая культура – гэта культура для шырокіх слаёў грамадства, для "ўсярэдненага, масавага чалавека". Прычым сёння спажыванне культурных каштоўнасцей становіцца надзвычай пасіўным, бо яно не патрабуе нейкіх асаблівых, прыметных духоўных высілкаў, інтэлектуальнага і эмацыянальнага напружання. Цяпер практычна адсутнічае творчае, крытычнае асэнсаванне тых ці іншых культурных феноменаў, каштоўнасцей, артэфактаў.

У 1990-х гг. Беларусь, як і ўсе ўсходнееўрапейскія краіны, адчула беспрэцэдэнтна моцную культурную экспансію заходняй цывілізацыі. Адбылася даволі моцная "вестэрнізацыя" беларускага культурнага топасу. Гэтая своеасаблівая "вестэрнізацыя" ўяўляе сабой культурную дыфузію заходнееўрапейскага і найперш амерыканскага вобраза і стылю жыцця, а таксама адпаведных ім каштоўнасцей, звычаяў, сімвалаў і культурных артэфактаў (фільмаў, відэакасет, камп'ютэрных праграм, кніг і інш.). Каб спыніць негатыўныя наступствы экспансіі замежнай масавай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, неабходна падняць эфектыўнасць так званых "нацыянальных культурных фільтраў" (народныя традыцыі, звычаі, абрады і інш.).

У мінулым і сёння маюць даволі шырокае міжнароднае прызнанне такія віды беларускай нацыянальнай культуры, як балет і опера. Менш вядомыя і прызнаныя ў замежных краінах беларускія кіно, выяўленчае мастацтва, скульптура. У Беларусі праводзіцца мноства міжнародных і рэспубліканскіх, рэгіянальных мастацкіх, музычных, тэатральных фестываляў і кінафестываляў. Многія беларускія майстры актыўна ўдзельнічаюць і атрымліваюць вышэйшыя ўзнагароды на міжнародных фестывалях, конкурсах. Аднак спецыфіка беларускай рэчаіснасці заключаецца ў тым, што сапраўды выдатныя культурныя дасягненні бываюць вядомымі толькі вузкаму колу творчых работнікаў, у той час як шырокую папулярнасць маюць прадстаўнікі "лёгкіх" жанраў – эстрадныя спевакі, музыканты, кінаакцёры (прычым найчасцей замежныя). Такім чынам, у цэлым беларускае грамадства адносна мала ўспрымальнае да "высокіх" жанраў мастацкай культуры. Іншымі словамі, "спажывальнікамі" сапраўднага мастацтва з'яўляецца невялікая частка нашага соцыуму – пераважна гарадскія высокаадукаваныя грамадзяне.

Беларусь – гэта краіна культуры буйных гарадоў (найперш сталіцы і абласных цэнтраў), у якіх знаходзіцца абсалютная большасць "ачагоў культуры". У той жа час значная частка насельніцтва нашай краіны жыве ў правінцыяльных малых і сярэдніх гарадах, сёлах. Для правінцыяльнай культуры ўласцівыя слабаразвітая культурная інфраструктура (тут нярэдка адсутнічаюць ці прысутнічаюць у невялікай колькасці тэатры, кінатэатры, музеі, мастацкія галерэі, публічныя бібліятэкі і інш.), запаволенасць культурнай дынамікі, адносна малая колькасць стваральнікаў твораў прафесійнай музычнай, тэатральнай, выяўленчай культуры. Жыхары беларускай вёскі не заўсёды маюць магчымасць далучыцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да найлепшых здабыткаў беларускай прафесійнай культуры. Таму атрымліваецца своеасаблівая культурная дыхатамія, калі ў вялікіх гарадах ствараюцца культурныя каштоўнасці высокага, часам нават сусветнага ўзроўню, а ў малых гарадах і вёсках новыя, сацыяльна значныя культурныя артэфакты ствараюцца вельмі рэдка і найчасцей вызначаюцца адносна невысокімі мастацкімі вартасцямі.

На пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры, якое адбылося ў студзені 2002 г., акрэслены найбольш важныя праблемы і вызначаны прыярытэтныя задачы ў сферы культурнага развіцця нашай краіны. Зараз неабходна ўзняць узровень наведвання тэатраў, павялічыць колькасць новых пастановак і канцэртных праграм, асабліва для дзяцей. Востра стаіць пытанне з паляпшэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы многіх арганізацый культуры, асабліва сельскіх. Не адпавядае сённяшняму часу іх забяспечанасць неабходным абсталяваннем, тэхнічнымі сродкамі, музычнымі інструментамі, сцэнічнымі касцюмамі. Акрамя таго, застаюцца актуальнымі праблемы камплектавання бібліятэчных фондаў, захаванасці музейных экспанатаў і інш. [4].

Пра асобныя негатыўныя моманты ў развіцці сучаснай беларускай культуры сведчаць таксама афіцыйныя статыстычныя даныя. На працягу 1990—2000 гг. скарацілася агульная колькасць публічных бібліятэк у РБ (таксама як і колькасць кніг і часопісаў ва ўсіх публічных бібліятэках); зменшылася колькасць устаноў клубнага тыпу; скарацілася колькасць наведвальнікаў музеяў і тэатраў; зменшыліся колькасць кніг і брашур, гадавыя тыражы часопісаў і газет (асабліва на беларускай мове). Напрыклад, з 1990 г. па 2000 г. колькасць публічных бібіліятэк у РБ скарацілася з 6239 да 5200, а устаноў клубнага тыпу адпаведна з 6030 да 4654. Агульная колькасць наведванняў музеяў (за год) скарацілася з 4,6 млн. у 1990 г. да 3,8 млн. у 2000 г., тады як музеяў за гэты час стала нават больш – 134 (у 1990 г. было 111).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Знізілася, як мы адзначылі вышэй, колькасць наведвальнікаў тэатраў, хаця лік прафесійных тэатраў за гэты час павялічыўся – з 21 да 27. За той жа перыяд колькасць кінаўстановак з платным паказам зменшылася з 6916 да 3063, а колькасць наведванняў кінасеансаў скарацілася са 117 млн. да 12 млн. у год.

У беларускай нацыянальнай культуры ёсць даволі вялікі культурны патэнцыял. Аднак яго трэба актуалізаваць. Таму ў сучасных умовах усім творчым работнікам трэба аб'яднаць свае творчыя намаганні, каб у адносна недалёкай будучыні дасягнуць так званай "кульмінацыі" культуры (паводле вызначэння амерыканскага этнолага Альфрэда Кробэра), гэта значыць яе сапраўднага росквіту, найвышэйшага ўзроўню развіцця.

---


1. *Дубянецкі С.Ф., Дубянецкі Э.С.* Цяжкі шлях да Адраджэння. — Брэст, 1997. — С.75.

2. *Крукоўскі М.І.* Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. — Мн., 2000. — С. 186.

3. *Смолік А.І.* Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме. — Мн., 1999. — С. 216.

4. *Гл.: Літаратура і мастацтва.* — 2002. — 1 лютага. — С. 2.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.А.Золотухин,**
*доцент*

## ТЕМА ДУХОВНОЙ ЖИЗНИ В ПРАКТИКЕ ТЕАТРАЛЬНОЙ РЕЖИССУРЫ БЕЛАРУСИ

Основным фактором динамики драматического театра является режиссура. Оформившись в самостоятельную театральную профессию, режиссура впитывает, генерирует